праграму, эфектна яе пачаць і яскрава завяршыць, знайсці агульную мову са слухачамі, заваяваць іх давер і ўвагу.

З гэтай мэтай можна падрыхтаваць на 2—3 хвіліны вусна ўступ да канцэрта. Своеасаблівай падрыхтоўкай аўдыторыі да ўспрыняцця канцэртнай праграмы можа стаць гутарка пра народнае мастацтва, пра членаў калектыву і асобныя музычныя творы. Галоўнае, каб такая гутарка не была стандартнай. Задача кіраўніка — зацікавіць слухачоў, прыцягнуць іх увагу. Рэзультатыўнасць сустрэч аркестравага калектыву са слухачамі залежыць таксама і ад стабільнасці складу слухацкай аўдыторыі, планамернасці ў змены рэпертуару канцэртаў, ад дысцыпліны ў зале падчас выступлення. Апошняе шмат у чым залежыць ад узаемадзеяння кіраўніка аркестра з педагогамі школы. Такім чынам, перш чым выйсці на сцэну, трэба ўлічыць шмат дробязей, ад якіх можа залежаць поспех калектыву і яго дзейнасці па музычным выхаванні слухачоў увогуле.

Даследаванне слухацкай аўдыторыі, праведзенае пасля аднаго з канцэртаў, дазволіла зрабіць некаторыя вывады, у прыватнасці, адносна эфектыўнасці канцэртнага выступлення. Так, у 52 % юных слухачоў з'явілася жаданне іграць у аркестры народных інструментаў; 18 % апытаных хацелі б навучыцца іграць на якім-небудзь народным інструменце; 60 % слухачоў хацелі б яшчэ раз прыйсці на канцэрт калектыву.

Такім чынам, апытанне пацвердзіла нашу думку аб высокім музычна-выхаваўчым эфекце выступлення аркестра народных інструментаў. Для стварэння такога калектыву і паспяховай яго музычна-выхаваўчай дзейнасці неабходна рэальная зацікаўленасць дзяцей у адпаведнай дзейнасці. Гэтаму можа спрыяць мэтанакіраваная і творчая праца кіраўніка аркестра ва ўзаемадзеянні з педагагічным калектывам школы. Крытэрыем ацэнкі дзейнасці калектыву з'яўляецца не колькасць канцэртаў, а ўся выхаваўчая работа, звязаная з дзейнасцю аркестра. Бо музычна-эстэтычнае выхаванне школьнікаў — гэта частка выхавання асобы чалавека ўвогуле.

І.М.ГРАМОВІЧ (МІК)

## ДА ПЫТАННЯ АБ ЗАХАВАННІ НАРОДНА-ПЕСЕННЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ФАЛЬКЛОРНЫХ ХАРАВЫХ КАЛЕКТЫВАХ БЕЛАРУСІ

Кожны сацыяльна-культурны ўздым у гісторыі грамадства звязаны са зваротам да мінулага, у прыватнасці да глыбінных пластоў народнай мастацкай творчасці. Такая заканамернасць узбагачае і паглыбляе культуру, памяць, традыцыі, па-новаму асэнсоўваецца духоўная практыка і яе каштоўнасць.

Народная мастацкая творчасць бытуе ў розных формах: адны з іх маюць векавыя традыцыі, другія толькі яшчэ акрэсліваюць свае абрысы. Сучаснае ўяўленне аб ёй звязана з той формай, якая атрымала поўны грамадскі статус і больш за ўсё арганізавана мастацкай самастойнасцю ці формамі, ідэнтычнымі традыцыям яе бытавання. Яна ўключае розныя жанры — тэатры, танцавальныя і харавыя калектывы, гурткі, ансамблі песні і танца, аркестры і музычныя ансамблі. Яна ўвайшла ў канцэртную практыку, прадстаўлена на вядучых сцэнічных пляцоўках, на тэлебачанні і радыё. Не менш важнае значэнне мае і другая, у вядомым сэнсе больш звычайная форма творчасці. Гэта творчасць фальклорнага тыпу, якая мае самае шырокае ўзаемадзеянне з жыццём. Уласна кажучы, яна і ёсць аснова мастацкай культуры грамадства, яе выток. Па багацці фальклору можна досыць дакладна меркаваць аб глыбіні традыцый і духоўным патэнцыяле народа. «Народная мудрасць» — менавіта так гучыць у перакладзе з англійскай мовы слова «фальклор». Народжанае сялянскай культурай, мастацтва вуснай традыцыі стала невычэрпнай крыніцай духоўнага ўзбагачэння народа. Адносіны чалавека да прыроды, да сябе самога, яго ўяўленне пра дабро і зло, пра прыгожае і агіднае змяшчаюцца ў кожным элеменце народнай культуры.

Узросшы інтарэс да фальклору — адна з асаблівасцей культурнага жыцця апошняга дзесяцігоддзя. Трэба думаць, што пераарыентацыя густу — вынік поўных працэсаў у развіцці мастацкіх ідэй. Паказваючы мінулае, воляй ці няволяй узрушваем сучаснае, прымушаем чалавека аналізаваць, думаць, адкуль ён прыйшоў, што радніць яго з продкамі, што адрознівае ад іх. Важнасць адкрыцця і вяртання да вытокаў нашай культуры заключаецца ў тым, што яна аднаўляе сувязь часоў, паказвае нашы карані.

Зараз фальклор перажывае як бы сваё адраджэнне. Ці не таму гэта адбываецца, што мы імкнемся вярнуцца да пачатку, да сутнасці? Калісьці А.М.Горкі гаварыў, што любое мастацтва пачынаецца з фальклору. Гэтая скарбніца захоўвае многія гістарычна праўдзівыя факты народнага быцця.

Арганічнай часткай народнай творчасці з'яўляецца харавая самадзейнасць. Мастацкі калектыў (ці то народны хор, ці фальклорны ансамбль) будзе народным у тым выпадку, калі ён увабраў у сябе мясцовыя народна-пеўчыя традыцыі, мае яркую нацыянальную афарбоўку, якая праяўляецца ў рэпертуары, манеры выканання, у асаблівасцях калектыўнай творчасці.

Сярод разнастайных сродкаў народнага выканання мастацкай калектыўнай творчасці належыць асобае месца. Тут кожны таленавіты спявак і стваральнік і выканаўца адначасова. Уменне імправізаваць, ствараць свежыя гукавыя фарбы — адна з самых каштоўных якасцей народных спевакоў-аматараў. Настойліва і пастаянна рэалізуючы гэтую якасць,

пеўчы самадзейны калектыў становіцца творчым калектывам. Раскрыццё мясцовых традыцый, багатай песеннай культуры становіцца для яго галоўнай выканальніцкай задачай. Слухаючы харавыя ансамблі Палесся і Паазер'я, Міншчыны і Магілёўшчыны, мы заўсёды знойдзем розніцу ў іх выканальніцкай манеры, у традыцыі мясцовага музіцыравання, у асаблівасцях харacводаў, адзначым таксама розныя варыянты адной і той жа песні.

Такім чынам, любы харавы калектыў ці ансамбль з'яўляецца выразнікам разнастайнасці беларускай песеннай культуры. У сучасны момант у нашай рэспубліцы існуе многа розных фальклорных калектываў. Іх можна падзяліць на тры віды: традыцыйныя, ансамблі народнай песні з удзелам моладзі і дзе-нідзе захаваныя народныя хары. Галоўнымі носьбітамі мясцовых пеўчых традыцый з'яўляюцца фальклорныя ансамблі, удзельнікамі якіх, як правіла, з'яўляюцца людзі старэйшага пакалення. Дзякуючы ім мы маем магчымасць пачуць сапраўды народныя спевы, сапраўдную беларускую народную песню, пачуць апавяданне аб старажытных абрадавых гульнях. «Шмат хараства і глыбокага зместу заложана ў беларускай народнай творчасці. Шмат мудрасці, трывогі і радасці, святла і горычы, шчырай любві і праўды захавала ў сваіх скарбах беларуская народная песня,» — пісаў Р.Р.Шырма ў кнізе «Песня — душа народа» [1].

У лепшых калектывах склалася высокае майстэрства народнага выканальніцтва. Дзякуючы ансамблеваму чуццю ствараецц ўмелае спляценне галасоў, якое ўражвае слухача ансамблевым адзінствам і музычнай цэласнасцю ўсёй песні, як быццам народжанае на вачах. Трэба адзначыць, што партытура песні можа змяніцца, калі яе запяе іншы запявала. Г.І.Цітовіч у кнізе «Аб беларускім песенным фальклоры» даў характарыстыку найбольш агульным рысам беларускай народнай песні [2].

Для беларускага аднагалосся характэрны напевы дыятанічнага складу. Пачынаецца песня звычайна з квартавага скачка. У сыходным напрамку мелодыя рухаецца паступова. Часцей за ўсё сустракаецца міксалідыйны лад, радзей — дарыйскі і фрыгійскі. Беларускім народным песням уласціва сілабічнасць, г.зн. у тэкстах пры спяванні сустракаюцца галосныя, якія ўтвараюць штучныя склады як у сярэдзіне, так і ў канцы слоў.

Г.І.Цітовіч адзначаў лірычны пачатак у традыцыйнай песеннай творчасці беларусаў. Выканальніцкая манера (асабліва палеская) адрозніваецца багатай арнаментацыяй. Унісоннае спяванне, якое існавала раней, стварыла глебу для зараджэння шматгалосся. Гэта як бы спяванне з пералівамі.

У другой палове мінулага стагоддзя на поўдні і паўднёвым усходзе Беларусі стаў распаўсюджвацца новы від шматгалосся — спяванне з

падводкай. На змену традыцыйнаму саліруючаму падгалоску прыходзіць група першых галасоў. Г.І.Цітовіч прасачыў развіццё і змяненне ў выканальніцкім стылі. Калі ў 30-я гг. бытаваў адзін выканальніцкі стыль з адкрытым грудным падгалоскам, то затым пад уплывам школы народнага выканальніцтва і аматарскіх хароў распаўсюджваецца групавое спяванне ў агульнапрынятай манеры.

Ужыванне рознай манеры спеваў у залежнасці ад бытавых умоў адзначалі амаль усе даследчыкі, якія займаліся вывучэннем народнай песні ў натуральных умовах яе бытавання.

Старэйшы беларускі кампазітар М.Чуркін у прадмове да свайго зборніка «Беларускія народныя песні і танцы», характарызуючы асаблівасці народнага выканальніцтва, пісаў: «Спяванне жанчыны дома, калі яна адна над калыскай, за калаўротам, за шыццём і г.д., ціхае. Спяванне яе апіраецца на ключычнае дыханне, словаўтварэнне — лёгкае — на губах... спяванне на паветры гучнае, энергічнае, з вялікім упорам на дыяфрагму і значным націскам на гартань» [3]. Аб свабодным імправізацыйным стылі ў народным песенным выканальніцтве піша ў сваіх даследаваннях В.Ялатаў [4]. Ён лічыць яго своеасаблівай унікальнай з'явай. У такой манеры выконваюцца калыханкі, пахавальныя плачы, песні сіроцкія, восеньскія, наогул «жаласлівыя» і веснавыя «загуканні». Значнае месца ў народна-песенным мастацтве Беларусі займае творчасць хору в.Вялікае Падлессе, што на Брэстчыне. Гэты калектыў захаваў самабытнасць народнага выканальніцтва, меладычныя асаблівасці, імправізацыйную свабоду. Галоўнае ў яго творчасці тое, што беларуская песня захоўвалася спевакамі ў тым стылі, у якім спявалася ў народзе. Этнаграфічная чысціня з'яўлялася характэрнай асаблівасцю выканальніцкай манеры хору.

Харавы калектыў в.Прыбыткі Гомельскага раёна таксама адзін са старэйшых калектываў Беларусі, які захаваў традыцыі народнай песні. У свой час гэта быў царкоўны хор, — адсюль манера і культура спеваў. З цягам часу ў яго рэпертуары з'явіліся народныя песні, прыпеўкі.

Адметнай рысай харавой творчасці на Гомельшчыне з'яўляецца непаўторнасць стылю выканання, самабытнасць, што адрознівае адзін калектыў ад другога. Напрыклад, для Тураўскага народнага хору характэрнай асаблівасцю з'яўляецца творчы пошук у фарміраванні рэпертуару, у выкананні твора. У чым сакрэт поспеху? А ў тым, што хор захаваў народныя традыцыі і самабытнасць манеры выканання. Кіраўнік гэтага калектыву М.Бяспалаў правёў вялікую работу па збіранні і апрацоўцы беларускіх песень, па асваенні мясцовых пеўчых традыцый.

У 1982—1984 гг. Л.І.Пятровай і Ю.І.Марчанка былі запісаны некалькі калектываў Гомельскай вобласці. Гэта калектывы в.Стаўбцы і сяла Янава Веткаўскага раёна. Выканальніцкі стыль ансамбляў у яркай форме адлюстроўвае культуру ўсходнепалескіх беларусаў. Выдатнае

валоданне традыцыйным рэпертуарам спалучаецца з дзіўным, а часам даведзеным да дасканаласці выкананнем.

Даследчык творчасці фальклорна-тэатральнага калектыву калгаса імя Я.Коласа Стаўбцоўскага раёна А.Аляхновіч піша аб тым, што стыль гэтага ансамбля таксама мае свае асаблівыя рысы. Так, спевакі пяюць у грудным рэгістры з ярка выражанай манерай, блізкай да гутаркавай мовы [5].

Але ўсё гэта было крыху раней. Зараз сярод маладых людзей, якія кіруюць фальклорнымі калектывамі, ёсць нямала таленавітых, сапраўдных знаўцаў і носьбітаў традыцый. Яны добра ведаюць манеру выканання беларускай народнай песні, яе стылістыку, характар. Ансамблі, якімі яны кіруюць, сталі вядомымі і заслужылі павагу слухача. Сярод іх «Крупіцкія музыкі» (кір. М.Гром) калгаса «Новы быт» Мінскага раёна, «Неруш» БДУ (кір. В.Гладкая), «Церніца» ПКВ (кір. Г.Сарока), «Валачобнікі» МІК (кір. С.Дробыш), «Ліцвіны» і інш. Кожны ансамбль мае свой твар, свой рэпертуар, сваю манеру выканання, свае прынцыпы работы над народнай песняй.

У творчым пошуку ансамблі гэтыя ідуць рознымі шляхамі. Удзельнікі ансамбля «Крупіцкія музыкі» і іх кіраўнік з'яўляюцца сапраўднымі захавальнікамі песенных і музычных традыцый свайго краю. Тут яны выраслі, тут яны ўвабралі прыгажосць, усё багацце і першародную часціню матчынай песні. Як спявалі тут у даўнія часы, так спяваюць і цяпер.

Студэнцкі калектыў «Неруш» (БДУ) мае ў сваім саставе маладых людзей з розных куткоў Беларусі. Яны вывучаюць беларускую народную песню і мову, праслухоўваючы шматлікія запісы фанатэкі і фальклорных экспедыцый. Яны вучацца народнай манеры выканання.

Ансамблі «Валачобнікі» і «Церніца» спяваюць апрацаваныя народныя песні. Іх творчая манера таксама мае свае асаблівасці.

Хто з іх ідзе найбольш правільным шляхам? Якія песні спяваць: апрацаваныя ці ў іх першародным выглядзе, што патрэбна ўзяць за эталон — аўтэнтычны ці стылізаваны фальклор? Пытанне вельмі складанае. Раней народныя песні спявалі ў полі, у лесе, за гаспадарчай працай, на вячорках, на розных святах. Часцей за ўсё гэта былі доўгія песні-балады з напружаным драматычным сюжэтам. Цяпер такую песню, выкананую на сцэне, слухач не зможа ўспрыняць як трэба. Народная песня патрабуе свайго асяроддзя, таго месца ўзнаўлення, дзе яна нарадзілася. А для таго каб зразумець і адчуць народную песню, існуе толькі адзін шлях — увайсці ў гэтае асяроддзе, вучыцца ў лепшых народных майстроў іх мове, іх майстэрству.

Народнае вакальнае мастацтва створана доўгай працай многіх пакаленняў народных выканаўцаў. Ад старэйшых да малодшых, ад нявопытных да найбольш сталых і больш творча самастойных — вось

такі бесперапынны працэс асваення навыкаў народнага пеўчага мастацтва.

Пераймание вопыту і майстэрства аднымі спевакамі ад другіх — стыхійны працэс. Метад вакальнага выхавання ў народным асяроддзі інтуітыўны. Вось чаму ў аснове вуснай традыцыі ляжаць зносіны людзей паміж сабой, дыялог, у якім субяседнікі бачаць і чуюць адзін аднаго. Пры гэтым важна не толькі тое, што гавораць, але і тое, як гавораць: інтанацыя, настрой, тэмбр голасу, нават пара года, месца, дзе адбываецца гаворка.

Выкладчык МІКа Н.Д.Баканава нарадзілася ў багатым песенным краі, на Брэстчыне. Яна ўсё жыццё праспявала на прафесійнай сцэне, спачатку працуючы ў Дзяржаўным акадэмічным народным хоры, а потым у квартэце «Купалінка». Надзея Давыдаўна запомніла мноства песень, запомніла тую гаворку, якую ўжывалі дома, запомніла манеру, у якой спявалі яе маці і суседскія жанчыны. «Ніхто мяне не вучыў, — гаворыць яна. — Вось, як пачала я пець, так і спяваю да гэтай пары».

Навучыцца разумець, а потым спяваць народную песню вельмі няпроста. Спачатку трэба нарадзіцца на сваёй зямлі і ўвабраць у сябе яе жыватворную сілу.

Хочацца адзначыць, што зараз даводзіцца чуць многа самых разнастайных манерных падробак пад беларускую песню. Але калі наша мастацтва было манерным, прымітыўным?

Псеўданародныя штампы і розныя стылізацыі атрымалі ў нас такое пашыранае распаўсюджанне, што для непадрыхтаванага слухача яны выступаюць у ролі сапраўднага мастацтва. Атрымліваецца фактычна эксплуатацыя народных узораў і разам з гэтым зняважанне традыцыі, вопыту стагоддзяў. І кожны калектыў на патрэбу публікі ўключае ў сваю праграму такія творы. А беларускія касцюмы? Ніколі яны не былі аляпаватымі, аднолькавымі. Кожная спявачка раней мела свой касцюм, кожная была самабытнай. Так што многія нашы сучасныя ансамблі і хары вельмі далёкія ад сапраўдных узораў, а галоўнае, скажаюць уяўленне аб сапраўдным нацыянальным мастацтве.

Сучасны стан народнай творчасці патрабуе вырашэння многіх яшчэ не вырашаных праблем. Амаль не вывучаны вакальна-пеўчы бок народнапесеннага майстэрства, не выпрацаваны дакладныя мастацкія крытэрыі ацэнкі твораў фальклору і іх выканання, не даследаваны уплыў асаблівасцей мовы, мясцовых дыялектаў на манеру выканання, а таксама не распрацаваны педагагічныя аспекты захавання пеўчых традыцый у розных рэгіёнах рэспублікі. Толькі веданне псіхолага-педагагічнай прыроды творчай дзейнасці харавых калектываў, найбольш поўнае авалоданне зместам педагагічных і творчых працэсаў, а таксама методыкай падбору рэпертуару, веданне асаблівасцей манеры спеваў забяспечвае кваліфікаванае кіраванне харавым калектывам і эфектыўнае педа-

гагічнае ўздзеянне на яго з мэтай захавання нацыянальных пеўчых традыцый.

ЛІТАРАТУРА

1. *Шырма Р.Р.* Песня — душа народа. Мн., 1976. С. 32. 2. *Цитович Г.* О белорусском песенном фольклоре. Мн., 1976. 3. *Чуркин Н.* Белорусские народные песни и танцы. М., 1949. С. 4. 4. *Елатов В.* Песни восточнославянской общности. М., 1977. 5. *Алехнович А.* Роль руководителя фольклорного коллектива в освоении песенного наследия // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1988. С. 7.

**В.І.ТРАМБІЦКАЯ (МІК)**

## НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЗАСВАЕННЯ ФАЛЬКЛОРУ У ДЗІЦЯЧЫМ НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНЫМ КАЛЕКТЫВЕ

Значны рост цікавасці да фальклору, які адзначаецца ў нашым грамадстве, вылучае пытанні аб ролі і месцы фальклору ў сучаснай мастацкай творчасці, формах яго існавання, сцэнічнага ўзнаўлення, прынцыпах і метадах засваення. Актуальнасць пытанняў тлумачыцца тым, што фальклор усё больш асэнсоўваецца як самабытны фактар духоўнасці, найбольш своеасаблівая частка нацыянальнай культуры.

Асаблівая ўвага надаецца праблеме захавання фальклору праз далучэнне да яго падрастаючых пакаленняў. Гэта спрыяе выхаванню іх у духу этычнасці, маральнасці, эстэтычнасці, патрыятызму, нацыянальнага ўсведамлення. Фальклор як мастацкая форма адлюстравання маральна-эстэтычных ідэалаў заўсёды актыўна ўжываўся ў народнай педагогіцы. Багацці фальклору асэнсоўваліся і прагрэсіўнымі дзеячамі рускай педагагічнай думкі. Так, народная песня, музыка характарызавалася як «носьбіт жывых індывідуальных асноў нацыянальнага выхавання» [1, с. 50]. Выказвалася ўпэўненасць, што «маючы ў запасе раскошны адукацыйны матэрыял народнай музычнай творчасці, было б вельмі неразважліва не скарыстаць яго на карысць школы, на карысць адукацыі народа» [1, с. 51].

З цягам часу фальклор усё шырэй пранікае ў прафесійнае і аматарскае выкананне, дзе прыцягвае ўвагу музыкантаў і выкладчыкаў у асноўным у якасці цікавага, арыгінальнага музычнага матэрыялу. Засваенне яго ў традыцыйнай музычнай педагогіцы вядзецца ў большасці рэпрадуктыўным спосабам і прынцыпова не адрозніваецца ад вывучэння класікі ці твораў сучасных кампазітараў.

Між тым фальклор уяўляе сабой самастойную цэльную мастацкую сістэму з уласнымі сродкамі выразнасці і заканамернасцямі развіцця. Уплыў фальклору на асобу значна паніжаецца пры ўспрыманні яго толькі праз рэпрадуктыўныя формы: кнігі, ноты, гуказапісы. А вось